# Критика и библиография

# Крытыка і бібліяграфія

# Review and bibliography

**Czasopismo Naukowe Instytutu Studiów Kobiecych. Tom 1–3.** Białystok: Wydawnictwo HUMANICA, 2016–2017.
**The Journal of the Institute of the Women Studies. Vol. 1–3.** Białystok: HUMANICA, 2016–2017.

Польская недзяржаўная арганізацыя Інстытут жаночых даследаванняў выпусціла ў 2016 г. першы нумар свайго выдання – «Навуковага часопіса Інстытута жаночых даследаванняў». Яно заяўлена як перыядычнае і выходзіць два разы на год. Перш чым звярнуць увагу на публікацыі, якія выйшлі ў часопісе, адзначым, што Інстытут жаночых даследаванняў пачаў працу ў 2011 г. у Беластоку і з таго часу яго нязменным кіраўніком з'яўляецца доктар гістарычных навук, прафесар Малгажата Дайновіч. Асноўныя напрамкі дзейнасці гэтай установы звязаны з арганізацыяй навуковых канферэнцый і круглых сталоў, правядзеннем навуковых даследаванняў у галіне гісторыі і сучаснага становішча жанчын, папулярызацыяй ведаў па гэтым пытанні ў грамадстве. Больш падрабязна аб дзейнасці Інстытута жаночых даследаванняў можна даведацца на яго інтэрнэт-старонцы (*http://isk.bialystok.pl*) або ў публікацыі доктара Марчына Сядлецкага «Інстытут жаночых даследаванняў – таварыства, якое пашырае навуковую дзейнасць (2011–2016)»[1, 2].

У структуры разглядаемага «Навуковага часопіса Інстытута жаночых даследаванняў» можна вылучыць тры асноўныя раздзелы: «Даследаванні і матэрыялы», «Рэцэнзіі», «Справаздачы». У апошняй рубрыцы асвятляюцца навуковыя канферэнцыі, якія адбыліся ў Польшчы і за яе межамі.

Калі ў першым нумары часопіса дамінуе польская праблематыка, то ў наступных выданнях геаграфія даследаванняў пашыраецца. Можна меркаваць, што праз нейкі час у часопісе будуць прадстаўлены сюжэты з жаночай гісторыі самых розных краін і кантынентаў. Звернем увагу на яшчэ адну асаблівасць выдання. У часопісе ўвага засяроджваецца менавіта на гісторыі жанчын і іх удзеле ў розных аспектах жыццядзейнасці грамадства, у той час як праблемы гендару і гендарнай гісторыі аўтарамі фактычна не закранаюцца.

У першым нумары «Навуковага часопіса Інстытута жаночых даследаванняў» Іаланта Хвастык-Кавальчык разглядае дзейнасць польскай журналісткі ў эміграцыі Стэфаніі Касоўскай, якая свой прафесійны досвед атрымала яшчэ ў міжваеннай Польшчы, Адам Мядоўскі аналізуе радыкальны фемінізм Аляксандры Калантай і дэманструе спробы рэалізацыі яе ідэй у Савецкай Расіі ў 1917–1922 гг., Уршуля Чвік высвятляе механізм адлюстравання праў жанчын на старонках часопіса «Жанчына і жыццё» («Kobieta i Życie»), Гражына Кендзерская выяўляе ўплыў меркавання эксперта ў найбольш вядомых судовых працэсах супраць жанчын.

Ролю жанчын у польскай арміі з гістарычнага пункта гледжання асвятляе Барбара Драпікоўская. Яна засяроджвае ўвагу на паўстаннях 1794, 1830–1831 і 1863–1864 гг., потым пераходзіць да разгляду падзей Першай і Другой сусветных войнаў. Аўтар зазначае, што з цягам часу роля жанчын у арміі ўзрастала, а іх функцыі пашыраліся, аднак пасля Першай сусветнай вайны ім забаранілі служыць у войску. Падзеі Другой сусветнай вайны змянілі гэту сітуацыю, калі пачалі ўзнікаць дзеючыя, выключна жаночыя вайсковыя фарміраванні. Аднак пасля заканчэння вайны жанчын зноў пазбавілі права і магчымасці служыць у войску. Сітуацыя часткова змянілася ў 1989 г., калі ім дазволілі слу-

[1]Тут і далей пераклад наш. – *Л. К.*
[2]*Siedlecki M.* Instytut Studiów Kobiecych – stowarzyszenie upowszechniające działalność naukową (2011–2016) // Czasopismo Naukowe Instytutu Studiów Kobiecych. 2016. № 1(1). S. 188–194.

жыць у медыцынскіх частках, а канчаткова – у 1999 г. пасля ўступлення Польшчы ў Паўночнаатлантычны блок.

Некалькі артыкулаў нумара прысвечаны сучаснаму становішчу жанчын ці іх вобразу ў грамадстве. Так, Юстына Зайко-Чаханьская звярнула ўвагу на тое, якім чынам у польскіх часопісах «Polityka» («Палітыка»), «Newsweek Polska» («Ньюсуік Польска») і «Wprost» («Впрост») адлюстроўваецца ўдзел жанчын у палітыцы. Яна прыйшла да высновы, што большасць згадваемых у выданнях асоб лічацца паспяховымі: яны займаюць высокія дзяржаўныя пасады, выконваюць дыпламатычныя функцыі, з'яўляюцца парламентарыямі ці міністрамі. Аўтары і супрацоўнікі рэдакцый падкрэсліваюць іх высокі прафесійны ўзровень, добрую падрыхтоўку і высокую кампетэнцыю, а таксама звяртаюць увагу на асабістыя якасці, знешні выгляд і нават прыватнае жыццё гераінь. Ю. Зайко-Чаханьская лічыць, што ў значнай ступені разглядаемыя ёю часопісы выконваюць выхаваўчую функцыю: яны імкнуцца змяніць шырока распаўсюджанае меркаванне, што жанчына павінна больш часу прысвячаць сям'і, чым грамадскай дзейнасці.

У сваю чаргу, артыкул Бэаты Гаворка-Складанэк прысвечаны разгляду вобраза жанчын у грамадскім і палітычным жыцці Расійскай Федэрацыі на падставе ўсерасійскіх апытанняў, праведзеных Цэнтрам Левады і Усерасійскім цэнтрам вывучэння грамадскага меркавання ў 2005–2016 гг. Аўтар зазначае, нягледзячы на гарантаваную канстытуцыяй роўнасць мужчын і жанчын, расіянкі лічаць, што іх абмяжоўваюць ва ўдзеле ў палітычным жыцці краіны. Пры гэтым у самім грамадстве, па даных сацыялагічных апытанняў, расце колькасць тых, хто лічыць, што жанчыны маюць роўныя з мужчынамі правы і павінны больш актыўна і масава прысутнічаць у палітыцы.

Артыкул Марчына Сядлецкага прысвечаны пытанню вызначэння этнічнай прыналежнасці мужчын і жанчын паводле перапісу насельніцтва 2011 г. у краінах Вышаградскай групы. Аўтар звяртае ўвагу, што падчас апытання 4,95 млн грамадзян адмовіліся пазначыць сваю нацыянальнасць. У залежнасці ад краіны адсотак такіх людзей вагаўся ад 1,4 да 25,3, пры гэтым жанчыны часцей ухіляліся ад адказу на пытанне. М. Сядлецкі лічыць, што гэта звязана з іх кансерватыўнасцю, большай прывязанасцю да грамадзянскіх абавязкаў і асцярожнасцю.

Польская праблематыка дамінуе і ў другім нумары часопіса. Тут пад увагай аказваецца святкаванне Міжнароднага года жанчын (1975 г.) на Беласточчыне як праяўленне дзейнасці рэспубліканскай арганізацыі «Ліга жанчын» на ўзроўні краіны і рэгіёна (Малгажата Дайновіч), разглядаецца працэс узнікнення, арганізацыйнага станаўлення і прапагандысцкай дзейнасці Кола міліцэйскіх сем'яў (Анна Марцінкевіч-Качмарчык), удзел жанчын у нацыянальна-дэмакратычным руху на тэрыторыі Познаньшчыны на мяжы XIX–XX стст. (Гражына Выдэр). Дзейнасць жанчын ва ўзброеных сілах розных краін раскрывае Караліна Кусьмірэк, у той час як Барбара Драпікоўская разглядае ўдзел жанчын-салдат у вайсковых місіях у Іраку і Афганістане. Аналіз такой з'явы, як эканамічны гвалт з боку жанчын прадстаўлены ў працы Гражыны Кендзерскай. На фоне палітычна-вайсковай праблематыкі артыкул Магдалены Эль Гамары выглядае незвычайна. У ім даецца ацэнка акаўнтаў мусульманак у *Instagram* з пункта гледжання модных культурных трэндаў сучасных жанчын з араба-мусульманскай культуры.

Трэці нумар часопіса мае яшчэ большую «геаграфію». Сярод новых сюжэтаў выдзелім матэрыял Кшыштафа Бухоўскага, прысвечаны Прэзідэнту Літоўскай Рэспублікі Далі Грыбаўскайтэ, і публікацыю Любові Козік пра сучасны стан беларускай гістарыяграфіі па праблеме ўдзелу жанчын у грамадскіх рухах Беларусі ў 1919–1991 гг. Расійская гісторыя прадстаўлена ў нумары артыкулам Бэаты Гаворка-Складанэк. Гэтым разам аўтар апісвае святкаванне Міжнароднага жаночага дня ў 1913–1991 гг.

Бэата Валенчук-Дэйнэка засяроджвае ўвагу на крыніцазнаўчым і адначасова літаратуразнаўчым аналізе фрагмента з успамінаў Марыі Мажыцкай-Абухоўскай. Аўтар лічыць іх важнай гістарычнай крыніцай, у якой раскрываюцца нюансы паўстання 1863–1864 гг., жыцця ў Сібіры пасля высылкі і забойства цара Аляксандра II, а таксама міжнацыянальныя адносіны ў царскай Расіі.

Фарміраванне вобраза прыслугі на старонках каталіцкага часопіса «Przyjaciel Sług» («Прыяцель слуг»), які выходзіў у 1897–1905 гг. у Кракаве, аналізуецца ў артыкуле Іаанны Мараўскай. Аўтар зазначае, што выданне звяртала ўвагу на маральнасць чытачоў і прапагандавала вобраз прыслугі як дзяўчыны сціплай, працавітай, пакорнай і набожнай, якая павінна быць узорнай гаспадыняй і клапаціцца пра сваю ўласнасць і ўласнасць сваіх гаспадароў.

У разглядаемым нумары Анна Марцінкевіч-Качмарчык працягвае аналізаваць Кола міліцэйскіх сем'яў (1968–1989). Гэтым разам яна засяроджвае ўвагу на мэтах і напрамках дзейнасці гэтай арганізацыі, якія, на яе думку, былі абумоўлены палітычнай і гаспадарчай сітуацыяй у Польшчы. Аўтар зазначае, што падчас грамадска-палітычных крызісаў Кола міліцэйскіх сем'яў, якое цесна супрацоўнічала з арганізацыяй «Ліга жанчын», падтрымлівала ўрадавую пазіцыю, а пасля пераходу краіны да дэмакратычнага развіцця спыніла сваё існаванне.

Публікацыя Магдалены Мусял-Карг прысвечана разгляду месца жанчын на польскім рынку пра-

цы. Прааналізаваўшы статыстычныя даныя, аўтар прыйшла да высновы, што ў сучаснай Польшчы жанчына мае менш за мужчыну шансаў атрымаць пажаданую працу, высокі заробак ці пасаду. Да ліку аб'ектыўных фактараў такой сітуацыі М. Мусял-Карг дадае і суб'ектыўныя: жанчыны самі сябе часам дыскрымінуюць, не вераць у свае сілы і баяцца прымаць адказныя рашэнні ў прафесійнай сферы. На яе думку, менавіта гэта аказвае ўплыў на зніжэнне іх пазіцый на сучасным рынку працы.

У разглядаемым нумары прадстаўлены і артыкул, звязаны з юрыспрудэнцыяй: Дыяна Дайновіч-Пясецкая на падставе Карнага кодэкса і разглядаемых у судзе спраў аналізуе сітуацыю з выкраданнем дзяцей і вызначае ролю ў гэтым правапарушэнні жанчын. Нягледзячы на тое, што выразнай розніцы ў даных няма, аўтар прыходзіць да высновы, што ў Польшчы жанчыны ў параўнанні з мужчынамі часцей выступаюць у якасці пацярпелых, чым злачынцаў.

Перавага польскага матэрыялу ў нумарах «Навуковага часопіса Інстытута жаночых даследаванняў», якія ўжо пабачылі свет, робіць выданне цікавым перш за ўсё для паланістаў. Аднак метадалогія даследаванняў, выбар праблематыкі, разгляд яе з пункта гледжання становішча жанчын і іх статусу ў грамадстве дазваляюць па-новаму паглядзець на, здавалася б, даўно вядомыя ў гісторыі сюжэты. З гэтай пазіцыі часопіс прадстаўляе інтарэс для шырокага кола спецыялістаў, падштурхоўвае іх да новых творчых пошукаў і магчымага перагляду некаторых ацэнак гістарычнага мінулага.

Напрыканцы нагадаем, што «Навуковы часопіс Інстытута жаночых даследаванняў» мае сваю інтэрнэт-старонку (*http://www.czasopismo.isk.bialystok.pl/*), дзе можна знайсці электронную версію ўсіх яго нумароў. Станоўчым бокам разглядаемага выдання з'яўляецца адкрыты доступ і размяшчэнне нумароў у самых разнастайных базах дадзеных і рэпазіторыях кшталту *Academia.edu*, *ResearchGate* і інш. Спадзяёмся, што такая палітыка рэдакцыі прывабіць новых аўтараў, а гэта, у сваю чаргу, прывядзе да разгляду новых праблем і сюжэтаў у «жаночай частцы» сусветнай гісторыі.

***Л. А. Козік***[3]

[3] *Любовь Антоновна Козик* – кандидат исторических наук, доцент; доцент кафедры истории южных и западных славян исторического факультета Белорусского государственного университета.

*Любоў Антонаўна Козік* – кандыдат гістарычных навук, дацэнт; дацэнт кафедры гісторыі паўднёвых і заходніх славян гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Lioubov A. Kozik*, PhD (history), docent; associate professor at the department of Southern and Western Slav's history, faculty of history, Belarusian State University.

E-mail: *lubov.kozik@gmail.com*